## ПАЛІТЫКА-ПРАВАВЫЯ ПОГЛЯДЫ НА УКРАІНЕ НА ШЛЯХУ РАЗВІЦЦЯ ЎКРАІНСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

**Е. І. Арлоўская**

Уваходжанне Беларусі, Расіі і Украіны ў новае тысячагоддзе як суверэнных дзяржаў суправаджаецца асэнсаваннем гістарычнага досведу станаўлення дзяржавы і права, які мае агульныя карані і які ўвабраў у сябе дасягненні прававой думкі трох брацкіх народаў.

Разам з тым на сёння ў Беларусі, як, зрэшты, на Украіне і ў Расіі, асноўнай тэмай навуковых пошукаў у сферы гісторыі і тэорыі дзяржавы і права з'яўляецца тэматыка, звязаная з развіццём нацыянальных палітыка-прававых дактрын; а таксама ўвага вучоных засяроджана на класічных еўрапейскіх прававых тэорыях. Вывучэнню гістарычных праблем развіцця дзяржавы і права сваіх бліжэйшых суседзяў надаецца значна менш увагі, што істотна стрымлівае развіццё навукі і, акрамя таго, не спрыяе палітыка-прававой кансалідацыі трох славянскіх дзяржаў – Беларусі, Украіны і Расіі. Карацей кажучы, у нашай краіне амаль нявывучанай тэмай застаецца спадчына ўкраінскай палітычнай і прававой думкі першай паловы XIX ст.

Такое становішча – значны прабел у гісторыі і тэорыі дзяржавы і права, паколькі многія погляды сучасных украінскіх палітыкаў, палітолагаў, сацыёлагаў, юрыстаў сфарміраваліся пад уплывам ідэй, закладзеных у першай палове XIX ст., і аналіз палітыка-прававых поглядаў гэтага перыяду дае магчамасць зразумець сучасныя працэсы, што адбываюцца ў палітычна-прававой сферы Украіны, якая з'яўляецца палітычным партнёрам Беларусі на міжнароднай арэне, як у сферы эканомікі, так і ў гуманітарнай сферы.

Безумоўна, вырашальнае значэнне для развіцця ўкраінскай паліталогіі, сацыялогіі, тэорыі дзяржавы і права мелі меркаванні кіраўнікоў Кірыла-Мяфодзіеўскага таварыства (1845–1846) і працы Н. І. Кастамарава (1817–1885), якія ў значнай меры пераклікаюцца з палітычным поглядам, характэрным для прадстаўнікоў усходніх абласцей Украіны, арыентаваных на расійскі вектар яе знешняй палітыкі.

У сувязі з гэтым у апошнія гады на Украіне вядуцца ажыўленыя дыскусіі адносна дзяржаўнага ладу, а менавіта разглядаецца варыянт пабудовы федэратыўнай дзяржавы, што падтрымліваецца палітыкамі ўсходніх абласцей Украіны і адвяргаецца ў Цэнтры і на Захадзе. Разам з тым палітыка-прававая дактрына федэралізму, што з'яўляецца адной са старэйшых ва ўкраінскай палітычнай думцы, сфарміравалася на Украіне пад уплывам славянафільскіх ідэй, якія праніклі на Украіну ў XIX ст.

Славянафільская тэорыя ўзнікла ў грамадскіх і культурных колах заходняга і паўднёвага славянства ў сувязі з узмацненнем ідэй пангерманізму і пастаяннай пагрозы турэцкага заняволення.

Тэрмін «панславізм» быў упершыню ўжыты славакам І. Геркелем у 1826 г. у «Граматыцы ўсеславянскай мовы». У першыя дзесяцігоддзі свайго распаўсюджвання панславізм садзейнічаў хуткаму ўзнікненню цэнтраў славянаведання ў Празе, Заграбе, Маскве, Харкаве і іншых гарадах.

У 40-х гг. XIX ст. ідэі панславізму выкарыстоўваліся рускімі філосафамі і пісьменнікамі М. Пагодзіным, Т. Аксакавым, Ф. Цютчавым, якіяператварылі яго ў рускі панславізм, сутнасць якога зводзілася да стварэння адзінай славяна-рускай дзяржавы ў супрацьпастаўленне «варожай Еўропе» [4, с. 97].

Непасрэдным праваднікам гэтых ідэй у Беларусі і Літве з`яўлялася група інтэлігенцыі, якая кансалідавалася вакол рэдакцыі цесна звязанай з «Петэрбургскім штотыднёвікам» часопіса «Рубон» (выходзіў у Вільні ў 1842–1849 гг.). Ідэйным натхняльнікам і выдаўцом часопіса быў гісторык, пісьменнік і публіцыст Казімір Буйніцкі (1788–1878). На старонках гэтага друкаванага органа панавалі славянафільскія і панславісцкія ідэі, крытыкаваліся ліберальныя і радыкальныя напрамкі грамадскай думкі [6, с. 200].

Таксама ў пачатку XIX ст. ідэі панславізму і славянскай федэрацыі пачалі развівацца на тэрыторыі Польшчы, дзе знайшлі своеасаблівую ідэйную інтэрпрэтацыю. Польскія грамадска-палітычныя дзеячы не ўспрымалі ідэі панславізму з вядучай роляй Расіі, але на адносіны паміж еўрапейскімі народамі яны глядзелі скрозь прызму тэорыі федэралізму. І ў гэтым, намагаючыся набыць незалежнасць хаця б у межах 1772 г. польскія грамадска-палітычныя дзеячы хацелі заручыцца падтрымкай Украіны. Яны вылучылі канцэпцыю аб існаванні рэспубліканскага парадку ў старой Польшчы, дзе ўкраінцы, беларусы і літоўцы мелі роўныя правы з палякамі [4, с. 125].

Украінская славянафільская тэорыя, што ўзнікла ў першай палове XIX ст., была адказам украінскіх інтэлектуалаў на рускую панславісцкую і польскую федэратыўную тэорыі, мела ў сваёй аснове яскрава выражаную рэлігійную падаплёку. Адной з характэрных асаблівасцей украінскага славянафільства было тое, што ў яго аснове ляжала ідэя гарманічнага аб'яднання палітычнай і рэлігійнай дактрын, пабудовы дзяржавы на свецкіх пачатках, але ў духу Праваслаўя. Такім чынам, першапачаткова ўкраінскі панславізм нёс у сабе складаны сінтэз рэлігійных, духоўных і палітычных пачаткаў, у чым і праяўляецца яго нацыянальная і ідэйна-палітычная своеасаблівасць. Прадстаўнікоў філасофскай думкі Украіны не задавальняла польская федэратыўная тэорыя, і яны ўспрынялі не польскі, а хутчэй расійскі падыход да праблем аб'яднання славян.

На Украіне ўпершыню ідэі аб славянскім адзінстве ў расійскай інтэрпрэтацыі сфармулявалі прадстаўнікі ўкраінскага нацыянальнага руху, якія ўвайшлі ў тайнае Кірыла-Мяфодзіеўскае таварыства (1845) – В. Белазерскі (1825–1899), М. Гулак (1821–1899), П. Куліш (1819–1897), А. Маркевіч (1822–1867), М. Кастамараў (1817–1885).

Заўважым, што ў гэта ж самае таварыства ўваходзіў і Т. Р. Шаўчэнка (1814–1861), які на сёння з'яўляецца сімвалам украінскай нацыянальнай ідэі, але паколькі ён не толькі ўваходзіў у гэта тайнае таварыства, але і падвяргаўся праследаванням з боку ўлад за ўдзел у арганізацыі, можна лічыць, што ён падзяляў ідэі кіраўнікоў таварыства, у тым ліку і адносна шляхоў развіцця ўкраінскай дзяржаўнасці.

Узнікла гэтая тайная палітычная арганізацыя ў снежні 1845 – студзені 1846 гг. у Кіеве. Дзейнасць Кірыла-Мяфодзіеўскага таварыства была адным

з прыкметных грамадска-палітычных падзей у жыцці Украіны 40-х гг. XIX ст. Вялікае значэнне мела культурна-асветніцкая дзейнасць таварыства, паколькі яго дзеячы выступілі актыўнымі барацьбітамі за развіццё і зацвярджэнне нацыянальнай мовы і культуры украінскага народа. Можна сказаць, што таварыства вырасла на славянафільскай глебе, але іх ідэі адрозніваліся ад рускіх ідэолагаў гэтага напрамку. Удзельнікі таварыства не супрацьпастаўлялі сябе Заходу, як гэта рабілі рускія славянафілы. Пацвярджэннем гэтага было іх імкненне наладзіць сувязі з дзеячамі вызваленчага руху іншых славянскіх народаў. На думку кірыла-мяфодзіеўцаў, украінскі народ зможа заваяваць належнае месца сярод народаў свету не шляхам адасобленасці, а ў выніку развіцця паміж імі раўнапраўных узаемасувязей.

Праграмныя палажэнні таварыства былі выкладзены ў «Кнізе быцця украінскага народа» і «Статуце Славянскага брацтва св. Кірыла і Мяфодыя», асноўным аўтарам якіх быў Мікалай Кастамараў, і ў «Запісцы», напісанай Васілём Белазерскім. У аснову дакументаў былі пакладзены ідэі ўкраінскага нацыянальнага адраджэння і панславізму.

Кірыла-Мяфодзіеўскае таварыства ставіла сваей асноўнай задачай будаўніцтва будучага таварыства на пачатках хрысціянскай маралі шляхам ажыццяўлення шэрагу рэформ: стварэння дэмакратычнай федэрацыі славянскіх народаў на прынцыпах роўнасці і суверэннасці; знішчэння царызму і адмены прыгоннага права; устанаўлення дэмакратычных правоў і свабод для грамадзян; ураўнанне ў правах усіх славянскіх народаў адносна іх нацыянальнай мовы, культуры і адукацыі.

Члены таварыства, аб’яднаныя агульнымі палітычнымі поглядамі, бачылі розныя шляхі іх ажыццяўлення – ад ліберальна-ўмеранага рэфармізму (Мікалай Кастамараў, Васіль Белазерскі, Панцеляймон Куліш) – да рэвалюцыйных метадаў барацьбы (Тарас Шаўчэнка, Мікалай Гулак, Георгій Андрузскі).

Члены брацтва вялі актыўную грамадска-палітычную дзейснасць: яны распаўсюджвалі праграмныя дакументы брацтва, у якіх былі выкладзены яго ідэі, пракламацыі («Да братоў-украінцаў», «Да братоў-велікаросаў і палякаў»). У дакументах таварыства сказана: «Прымаем, што духоўнае і палітычнае аб’яднанне славян ёсць сапраўднае іх прызначэнне, да якога яны павінны імкнуцца <...> Прымаем, што кожнае племя (г. зн. славянская нацыя) павінна мець праўленне народнае і падтрымліваць поўную роўнасць суграмадзян па іх нараджанні, хрысціянскіх веравызнаннях і стану» [5, с. 297]. Задача аб’яднання славян канкрэтызавалася ў двух непарыўна звязаных накірунках: стварэнні дэмакратычнага раўнапраўнага саюза славянскіх народаў (рускіх, украінцаў, беларусаў, палякаў, чэхаў, славенцаў, лужычан, сербаў, харватаў і балгар) у межах федэратыўнай дзяржавы, а таксама ў культурным і сацыяльным адраджэнні Украіны.

Гэтыя ідэі былі поўнасцю ўспрыняты і развіты М. І. Кастамаравым, палітычныя і навуковыя погляды якога скláліся пад уплывам і глыбокім асэнсаваннем нямецкай класічнай філасофіі. М. І. Кастамараў – яркая асоба, чыя творчасць ахоплівала найшырэйшыя навуковыя і грамадска-палітычныя інтарэсы перадавой украінскай інтэлігенцыі сярэдзіны і другой паловы XIX ст. Упершыню ва ўкраінскай навуцы М. Кастамараў звярнуўся да праблем этнагенезу ўкраінцаў, а таксама заснаваў этнапсіхалогію, стараўся параўнаць украінцаў, расіян і палякаў з псіхалагічнага пункту погляду. Шэраг яго артыкулаў прысвечаны пытанням абгрунтавання існавання дзвюх ці больш народнасцей і палеміцы з польскімі і рускімі аўтарамі, якія адмаўлялі такое дзяленне [1, с. 41]. Вучоны выказаў меркаванне аб тым, што свет Старажытнай Русі складаўся з некалькіх народнасцей. У славянскай абшчыне М. І. Кастамараў, як і многія другія прадстаўнікі ўкраінскай інтэлігенцыі XIX ст., бачыў элементы народаўладдзя, з якім звязваў магчымую перабудову грамадства на федэратыўнай аснове. На яго думку, разам паўночна-рускія і паўднёва-рускія ствараюць рускі народ, але пры ўмове, што кожны з іх будзе захоўваць культурную аўтаномію. Саюзнасць, г. зн. устанаўленне федэратыўнага дзяржаўнага ладу па Кастамараву, магчыма толькі калі ўсе суб'екты роўныя, і пры гэтым аб'ём культурнай аўтаноміі аднолькавы. Таму, як лічыў М. І. Кастамараў, украінскі народ павінен жыць з расіянамі і даць такому суіснаванню «адухатвораны пачатак» [2, с. 58].

Погляды М. І. Кастамарава больш радыкальныя, калі гутарка ідзе аб узаемаадносінах украінцаў і палякаў. Тым не менш, М. І. Кастамараў адзначае, што польская арыстакратыя з'яўляецца значна больш дэмакратычнай у супрацьлегласць арыстакратычнай паўднёва-рускай дэмакратыі. «Там (у Польшчы) панства шукае роўнасці ў межах свайго саслоўя, тут народ, роўны па правах і стану, выпускае са сваей массы адметных асоб і потым імкнецца паглынуць іх у сваей жа масе» [3, с. 25]. Прымкнуўшы да палякаў, украінцы, па меркаванні М. Кастамарава, нічога не атрымаюць, «але могуць стаць іх ахвярай», аб сумесным жыцці ўкраінцаў і палякаў у адной дзяржаве нельга і гаварыць: ад апошніх украінцы могуць запазычыць толькі панства, а яно «забівае нашу народнасць» [3, с. 26].

Арыгінальная тэорыя федэралізму выкладзена М. І. Кастамаравым у працы «Думкі аб федэратыўным пачатку ў старажытнай Русі», дзе гаворыцца: «Нам прадстаўляецца федэратыўны лад як самае шчаслівае цячэнне грамадскага жыцця славянскіх нацый. Мы сталі ўяўляць усе славянскія народы злучанымі паміж сабой у федэрацыі, накшталт старажытных грэчаскіх рэспублік, або Злучаных Штатаў Паўночнай Амерыкі, з тым, каб усе знаходзіліся ў трывалай сувязі паміж сабой, але кожная свята захоўвала сваю асобную аўтаномію» [2, с. 25].

Абгрунтаванне федэратыўнай арганізацыі дзяржаўнасці (удзельнасці) М. І. Кастамараў знаходзіў у гісторыі Кіеўскай Русі, яе палітычнай сістэме,

якая імкнулася да федэратыўных асноў, на падставе чаго сфарміравалася дзяржаўна-адміністратыўная структура старажытнай Русі. «Удзельнасць, – на думку Кастамарава, – гэта такі парадак, пры якім самабытныя часцінкі, не знішчаючы сябе і не спыняючы сваёй адасобленасці, разам ствараюць адно цела дзяржавы» [2, с. 18]. Перавагі такога ладу па М. І. Кастамараву відавочныя: на тэрыторыі старажытнай Русі існавалі княствы, па сутнасці самабытныя землі, створаныя па «натуральныму дзяленню», якія абумовілі магчымасць суіснаваць этнагеаграфічна розным па сваёй культуры, ментальнасці, мове славянам у адзінай дзяржаве.

Улічваючы тое, што гісторыя Украіны не ведала поўнага федэралізму, М. І. Кастамараў звязваў развіццё ўкраінскага народа менавіта з такой формай арганізацыі. «У будучым Славянскім саюзе, у які мы верым і да якога імкнемся, – піша М. І. Кастамараў, – наша паўднёвая Русь павінна складаць адну дзяржаўную цэласнасць на ўсёй прасторы, дзе народ размаўляе па-ўкраінску, захоўваючы адзінства (з Расіяй), заснаванае не на знішчальнай, мёртвай цэнтралізацыі, але на ясным усведамленні раўнапраўя сваёй асабістай карысці...» [2, с. 25]. М. І. Кастамараў у працы «Думкі аб федэратыўным пачатку ў старажытнай Русі» надаваў асаблівую ўвагу растлумачванню менавіта прынцыпаў дэмакратычнага федэралізму. Значным з'яўляецца таксама і тое, што гэты твор у адрозненне ад шматлікіх манаграфій і даследаванняў М. І. Кастамарава даволі глыбока раскрывае яго гістарыяграфічную тэорыю, пакладзеную ім у аснову канцэпцыі гісторыі Украіны.

Дэмакратычны федэралізм М. І. Кастамарава нельга лічыць тоесным іншым яго разнавіднасцям, асабліва нацыянальна-гістарычнаму федэралізму. З'яўляючыся федэралістам, прыхільнікам агульнаславянскай федэрацыі і дэмакратызацыі Рускай імперыі, ён абгрунтоўваў захаванне ў ёй права ўкраінскага народа на стварэнне асабістай дзяржавы, свабоднае развіццё нацыянальнай мовы, культуры і г. д. Яго ідэя панславізму грунтуецца не на перавазе адной народнасці над іншымі, а на раўнапраўі і агульнай свабодзе [2, с. 28].

Федэраліцкая канцэпцыя М. І. Кастамарава час ад часу выклікала на яго атакі з боку афіцыйных колаў, якія справядліва бачылі жаданне М. І. Кастамарава ўнесці істотныя дырэктывы ў нацыянальную палітыку Расійскай імперыі. Адказваючы сваім крытыкам, М. І. Кастамараў увесь час падкрэсліваў, што ён займаецца вывучэннем і аналізам федэратыўных прынцыпаў мінулага толькі як гісторык і не больш таго. І сапраўды, вучоны дэманстраваў сваё адмежаванне ад практычнай палітыкі, тым не менш яго пазіцыя па адзначаных пытаннях не магла не чытацца паміж радкоў – сапраўднае самакіраванне і федэрацыя немагчымы без знішчэння цэнтралізму і абсалютызму, прызнання права за кожным народам на развіццё асабістай дзяржаўнасці, культуры.

Такім чынам, палітычная думка на Украіне ў першай палове XIX ст. развівалася, з аднаго боку, пад уплывам расійскіх панславісцкіх ідэй, а з другога боку, – менавіта ў гэты перыяд прадстаўнікамі ўкраінскай палітычнай і прававой думкі былі сфармуляваны ідэі адносна неабходнасці арыентацыі Украіны на славянскі свет. Гэтыя ідэі актуальныя для сучаснай украінскай палітычнай сітуацыі і з'яўляюцца прадметам ажыўленых дыскусій і спрэчак ва ўкраінскім грамадстве.

### Літаратура


1. *Костомаров Н. И.* Две русские народности (Письмо редактору) / Н. И. Костомаров // Основа. – Спб, 1861. – № 3. – С. 33–80.
2. *Костомаров, Н. И.* Мысли о федеративном начале в древней Руси / Н. И. Костомаров // Исторические монографии и исследования. – М.: Книга, 1990. – 236 с.
3. *Кулікова, М. В.* Політична думка України на зламі століть: маловивчені аспекти національної ідентичності / М. В. Кулікова // Розбудова держави. – 2004. – № 6. – С. 23–28.
4. *Кухта, Б. Л.* З історії української політичної думки: Тексти лекцій / Б. Л. Кухта. – Київ: Генеза, 1994. – 368 с.
5. *Симоненко, Р. Г.* Кирило-Мефодіївське товариство / Р. Г. Симоненко // Енциклопедія історії України. – Київ: Наукова думка, 2007. – Т. 4. – С. 297–298.
6. *Шалькевіч, В. Ф.* Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск: МНО, 2002. – 248 с.